■ Тэхналогіі для жыцця

# АДХОДЫ, ЗДАВАЙЦЕСЯ!

## Як выглядае «вядро» для зручнага сартавання смецця?

**Ці выкідваеце вы ўпакоўку з-пад малака, спісаны сшытак альбо бутэльку з-пад ліманаду ў асобныя пакеты? Банальная лянота і нежаданне «замарочвацца» часам забіваюць гэтую звычку. У такія моманты нават забываюся, што сартаванне — не экалагічны капрыз. Перапрацаваныя адходы могуць атрымаць другое жыццё, вызваліць палігоны ды сэканоміць рэсурсы, даць зямлі магчымасць дыхаць вальней.**

Удзельніца ініцыятывы «Чыстая справа» Надзея РЫНКЕВІЧ выкарыстоўвае для сартавання звычайныя скрыні з-пад абутку. Шкло дзяўчына выкідвае ў спецыяльны кантэйнер, які стаіць каля дома. Смецці для іншых відаў адходаў, акрамя змяшаных, у двары няма. Таму даводзіцца «выкручвацца». Сёлета думка пра зручны хатні кантэйнер для адходаў аформілася ў бізнес-праект, які затым перарос у сацыяльную ініцыятыву. Студэнты чацвёртага курса эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ілья Калчанаў, Валянцін Дашкевіч, Надзея Рынкевіч, Настасся Кміт сустрэліся ў Школе прадпрымальніцтва і менеджмента БДУ і з лёгкай рукі выкладчыцы па эканаметрыцы аб'ядналіся ў «Чыстую справу».

— Нам прапанавалі паўдзельнічаць у алімпіядзе стартапаў, якая праходзіла ў Маскве сёлета ў красавіку, — распавядае Надзея. — На той момант Ілья і Валянцін ужо мелі ідэю наладзіць вытворчасць зручных урнаў для сартавання адходаў у хатніх умовах. Канструкцыя вельмі простая: круглае вядро, падзеленае на чатыры часткі рознага колеру: сіняя — для шкла, жоўтая — для пластыку, зялёная — для паперы, чырвоная — для змяшаных адходаў. Дызайн прыдумалі самі, папярэдне азнаёміўшыся з вынаходкамі нашых папярэднікаў.


Круглае вядро, падзеленае на чатыры часткі: такім бачаць хатні кантэйнер для адходаў.

Раздрукаваўшы дэманстрацыйную мадэль на 3D-прынтары, «Чыстая справа» адправілася на алімпіяду ў Маскву, дзе іх ініцыятыва атрымала добры водгук. Аднак, нягледзячы на поспех, студэнты зразумелі: задуму са сметніцамі ў Беларусі немагчыма рэалізаваць як паспяховы бізнес-праект.

**Часта даводзіцца чуць: навошта сартаваць адходы, калі я на свае вочы бачыў, што смеццявоз загружае ўсё разам? Аб практыцы дасартавання смецця, вядома, людзі не ведаюць.**

— Мы гутарылі з прадстаўнікамі завода «Белпласт». Яны пагадзіліся наладзіць вытворчасць пры ўмове, калі за месяц будзе прададзена не менш за 5 тысяч кантэйнераў, — адзначае Ілья. — Зразумела, што такога попыту на вядзерцы ў нашай краіне папросту няма. Людзей, якія сартуюць адходы, у Беларусі вельмі мала, а тых, хто гатовы аддаць грошы за прыладу для асобнага збору, яшчэ менш.

Такім чынам задача «Чыстай справы» змянілася: каманда вырашыла сфарміраваць попыт на хатнія сметніцы. Іншымі словамі, студэнты-эканамісты захацелі зрабіць сартаванне адходаў звычнай для беларусаў справай. Тым больш, па іх назіраннях, людзі не супраць атрымаць такія веды. Многія хочуць пачаць, але не ведаюць, як зрабіць гэта правільна.


Надзея РЫНКЕВІЧ сартуе смецце. А вы?
Фота Надзеі БУЖАН.

— Часта даводзіцца чуць: навошта сартаваць адходы, калі я на свае вочы бачыў, што смеццявоз загружае ўсё разам? Аб практыцы дасартавання смецця, вядома, яны не ведаюць, — адзначае Ілья. — Каб такія пытанні не ўзнікалі, трэба расказваць папулярна.

Удзельнікі «Чыстай справы» вывучалі вопыт асобнага збору адходаў у іншых краінах. Германія і Швейцарыя не за адзін дзень прыйшлі да наладжанай сістэмы — для гэтага ім спатрэбілася 40-50 гадоў. Але пачыналі яны з навучання як дарослых, так і дзяцей.

— Прывяду адзін прыклад: у Еўропе нават кухні зроблены такім чынам, што пад мыйкай ёсць некалькі розных скрынь для розных відаў адходаў. Гэта стандарт. А ў нас, калі чуюць пра асобны збор адходаў дома, кажуць: «У мяне на кухні і так месца няма, куды я буду выкідаць?». Пакуль людзям цяжка ўсвядоміць, што смецця больш не стане, проста яно будзе ў розных адсеках складвацца. Гэта сведчыць аб тым, што мы знаходзімся ў самым пачатку шляху ў пытанні асобнага збору.

Пачаць адукацыйную кампанію вырашылі з дзяцей — гэтая аўдыторыя найбольш адкрыта да ўспрымання новых ведаў. У першыя тыдні верасня «Чыстая справа» пачне праводзіць у школах азнаямляльныя заняткі па сартаванні смецця. Ідэю маладых людзей у самых адукацыйных установах прымаюць «на ўра». Студэнты распрацавалі тры праграмы, разлічаныя на розныя ўзроставыя катэгорыі. Яны пазнаёмяць з асновамі асобнага збору другакласнікаў, шасцікласнікаў і васьмікласнікаў — усяго завітаюць у 9 сталічных школ. Актывісты пастараюцца пазбегнуць сухой інфармацыі, а ў кабінетах установяць урны для пластыку і паперы. Над кожным вядром для смецця будуць вісець запамінальныя тлумачальныя карцінкі.

— У нас няма задумы абысці ўсе школы Мінска — мы хочам паглядзець на рэакцыю дзяцей, бацькоў, настаўнікаў, — кажа Валянцін. — Таксама ўстановім кантэйнеры і ў нас на факультэце, паглядзім, што з гэтага выйдзе.

Ужо сёння экалагічная ініцыятыва атрымала падтрымку ад зацікаўленых калег. Напрыклад, беларуска-нямецкае прадпрыемства па абыходжанні з адходамі «Рэмондис Мінск» гатова бясплатна ўстанавіць у школах кантэйнеры для змяшаных адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў. Некамерцыйная грамадская арганізацыя «Экапартнёрства» дапамагае інфармацыйнымі матэрыяламі: іх «Гісторыя пра адходы» пакладзена ў аснову ўрокаў.

**У Еўропе нават кухні зроблены такім чынам, што пад мыйкай ёсць некалькі розных скрынь для розных відаў адходаў. Гэта стандарт. А ў нас, калі чуюць пра асобны збор адходаў дома, кажуць «у мяне на кухні і так месца няма, куды я буду выкідаць?»**

Ілья падкрэслівае, што даследаванне эксперыментальнае. Па яго выніках «Чыстая справа» напіша справаздачу ў Міністэрства адукацыі і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольля з прапановай аб стварэнні курса па экалогіі, на якім дзяцей навучылі б сартаваць адходы. Каманда збіраецца і далей актыўна праводзіць інфармацыйныя кампаніі. Як толькі людзі навучацца сартаваць адходы, «Чыстая справа» вернецца да першапачатковай задумы: будзе прасоўваць хатнія вядзерцы для адходаў.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

■ Вусы, лапы, хвост

# Даўгавухі энерджайзер

## Калі ў сабакі пераходны ўзрост...

**Выбіраючы сабаку для падлетка, не варта арыентавацца толькі на жаданні будучага гаспадара. Напрыклад, мінчанін Ваня ПАЛЕВІКОЎ марыў пра хаскі. Старэйшая сястра Юля вырашыла ашчаслівіць хлопца. І на свой дванаццаты дзень нараджэння Ваня атрымаў двухмесячнага бігля — ён значыўся на другой «прыступцы» жаданняў. Сабака паляўнічай пароды аказаўся з характарам...**

Раней у сям'і быў кокер-спаніэль, з якім ладзілі ўсе — гэта яркі прыклад кампаньёна, які з кожным знойдзе агульную мову. Іншая справа — біглі: прадстаўнікі гэтай пароды не будуць проста так служыць гаспадару, яны яшчэ падумаюць, слухацца яго ці не. З першых дзён шчаня пачало дысцыплінаваць сваіх гаспадароў. Для пачатку сабака пагрыз тэлефон і зарадку. Пасля дабраўся да сцен. Паеў усе кветкі.

— Заводчыкі адразу папярэдзілі, што сабаку трэба трымаць у клетцы, але для мяне гэта быў нонсэнс, — узгадвае Юля. — Пасля таго, як Арчыбальд пагрыз дзверы, давялося набыць яму такое часовае жытло, і тады сабака зразумеў, дзе яго месца. Цяпер яму ўжо год, паводзіць сябе больш прыстойна, таму трымаць яго ў клетцы ўжо не трэба.

Шчанюком Арчы паспяваў паесці па тры разы на дзень, таму дзеці запомнілі, што ежу нельга пакідаць без нагляду. Цяпер яны кладуць яе на на сярэдзіну стала, бо калі пакласці з краю, гэта справакуе сабаку сцягнуць смакату.

І ў Вані, і ў Арчы зараз, так бы мовіць, пераходны ўзрост, і ў гэтым іх падабенства. Даўгавухі сябар яшчэ малы, таму не надта слухаецца свайго гаспадара. Але спіць з ім разам на канапе. Увогуле, ён любіць паказаць характар. Напрыклад, Арчы не любіць заставацца адзін і таму помсціць: хаваецца і доўга не паказваецца. Сабакі гэтай пароды вельмі энергічныя і без актыўнасці не вытрымліваюць: з імі трэба праводзіць як мінімум 2-3 гадзіны на выгуле. Інакш жывёла пачынае дурэць і шкодніčаць.


Арчы вельмі любіць гуляць з дзецьмі.
Фота Надзеі БУЖАН.

Хоць на Арчы наракаюць (маўляў, непаслухмяны), ён усё ж паддаецца дрэсіроўцы, па камандзе садзіцца і дае лапу. На вуліцы яго трымаюць на павадку, бо, адчуўшы свабоду, сабака можа страціць кантроль. Бігль вельмі любіць авантуры, прыгоды, таму не дзіва, што з ім цяжка справіцца. Часам ён настолькі захапляецца пошукамі, што можа забыцца пра чалавека.

— Бігль, калі бачыць слабасць гаспадара, мае здольнасць кіраваць яго дзеяннямі, — кажа **кінолаг Андрэй ШКЛЯЕЎ**. — У маёй практыцы сустракаліся выпадкі, калі сабакі што хацелі, таго і дабіваліся ад сваіх гаспадароў. Каб выхаваць бігля, ні ў якім разе не трэба патураць яму, не давайце і маленькай магчымасці атрымаць усё, што ён захоча. А вось упартасць і незалежнасць — яркія рысы «сышчыка», вельмі патрэбныя на паляванні.

Свавольнік заўжды разумее, калі ён вінаваты. Сабаку «караюць» ігнараваннем. Арчы хаваецца ад гаспадароў, а праз некаторы час, «падумаўшы» над сваімі дзеяннямі, вяртаецца, як быццам нічога і не здарылася.

Аднойчы вушастаму выпала сабачае шчасце. Бабуля Вольга дастала з лядоўні палку каўбасы, і тут ёй патэлефанавалі. Ведаючы, што Арчы спіць, яна спакойна пайшла пагутарыць. А калі вярнулася, той ужо расправіўся са смакатой. Пасля далікатэсу яго званітавала, бо звычайна кормяць сабаку выключна сухім кормам. Аднак гэта не перашкаджае Арчыбальду красці агуркі ў чарапахі, цікаваць за кавалкамі кавуна ці марожанага.

Кінолагі раяць звадзіць бігля на паляванне, аднак Арчыбальду пакуль што пашанцавала пабываць у паходзе, дзе ён праявіў сябе як вартаўнік і павадыр — вёў за сабой Юлю і яе дачку Варвару.

Асаблівага догляду, акрамя інтэнсіўных прагулак і дрэсіроўкі, ён не патрабуе: нават купаць бігляў можна толькі два разы на год, гэта вельмі ахайныя сабакі. Чысцяць поўсць раз на тыдзень і абавязкова правяраюць доўгія вушы.

Можна сказаць, што Арчы — цяжкі падлетак, якому вельмі патрэбна ўвага: ён заўжды далучаецца да дзіцячых гульняў. Біглю пакуль ўсяго год, Ваня і Юля стараюцца не патураць ягоным капрызам, бо, як вядома, ад выхавання і навучання сабакі залежыць, якім ён вырасце.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

### ЯКІМІ ЯКАСЦЯМІ МУСІЦЬ ВАЛОДАЦЬ САБАКА-КАМПАНЬЁН?

Для такой ролі падыходзяць жывёлы сярэдняга ці малога памеру, з якімі зможа справіцца любы член сям'і, з неагрэсіўным характарам. У сабакі мусіць быць поўсць, якая не патрабуе асаблівага догляду. Ён не павінен быць звышэнергічным. На ролю сабакі-кампаньёна кінолагі раяць выбіраць лабрадораў, дэкаратыўных спаніэляў, пудзеляў, памеранскіх шпіцаў, мопсаў.